...ЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 276 (1243) | НЯДЗЕЛЯ, 30-га лістапада 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 "
6 месяцаў	1 р. 80 "
1 год	3 р. 30 "

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Беларускі нацыянал-дэмократызм—агэнт сусьветнага імпэрыялізму

...гутныя посьпехі гіганцкай бу... ў СССР, дасягнутыя на асно... партага ажыцьцяўленьня гена... лініі партыі ў бязьлітаснай ...ацьбе з агентурай клясавых во...—правым ухілам і яго саюзь... «левымі», выклікалі ня толь...тыўнае супроцьдзеяньне рэш... варожых клясаў у нашай краі...—яны выклікаюць скрыгат зу... сусьветнай буржуазіі.

...сім зразумела, што кожны наш ...пех, умацоўваючы грунт со...лізму, павялічваючы магут... Савецкага Саюзу—бацькаў... ўсіх працоўных—удар па ...хнелых устоях сусьветнага капі...стычнага ладу.

...ны рост магутнасьці СССР,—...льнае і пасьпяховае ажыцьцяў... пяцігадовага пляну соцыялі... перабудовы нашай краіны; ...шавіцкія тэмпы нашай работы, ...зьяўляюцца вынікам вялікага ...у актыўнасьці рабочых мас—...нстрацыяй адданасьці гена... лініі партыі і поўнага да... яе ленінскаму ЦК—усе гэтыя ...тары, садзейнічаючыя рэволю...аму змаганьню шырокіх пра... мас усяго сьвету—выклікаюць шалёнае імкненьне буржуазіі ...ваваць Савецкі Саюз, як ня...чы агач сусьветнай рэволюцыі.

...цоўныя Саюзу і ўсяго сьвету ...з Дому Саюзаў пралетарс... Масквы маюць магчымасьць да... аб агіднейшых дзеяньнях ...рэвалюцыйнай «Промпартыі» ...іне разгортваньня шкодніцтва ...рыхтоўкі інтэрвэнцыі супроць ...

...талістычныя драпежнікі пад ...ніцтвам францускага генэраль... штабу «намыльвалі пятлю», ...валі шыбеніцы для працоўных ...кай краіны.

... імкнуліся пасадзіць на шыю ...оўных СССР выкінутую за ме... капіталістычную зграю.

...кой пролетарскай дыктатуры—... прадстаўнікі інтэрвэнтаў у ну... краіны і іх натхніцелі з фран... генэральнага штабу злоў... з палічным—прадсталі перад ... пролетарыяту ўсяго сьвету. ...цоўныя СССР сягоньня даве... аб контррэволюцыйных дзе... сабратаў Рамзіных, Канд... у твары выкрытай ДПУ ...русі контррэволюцыйнай інтэ... групы беларускіх нацы...-дэмакратаў, якя заяў...ючыся ...амі сусьветнага фашызму па ...казцы праводзілі ў БССР пад...ную контррэвалюцыйную рабо...

...арта ажыцьцяўляючы ленінскія ...цыпы нацыянальнай політыкі, ...ортваючы рашучую барацьбу ...оць вялікадзяржаў... расій... шовінізму, які ... ... га...ую небясьпеку, КП(б)Б і пад яе ...ніцтвам працоўныя БССР за ...ія гады таксама правялі ра...ую барацьбу супроць контррэво...йных тэорый беларускіх нацыя...-дэмократаў, выкрыўшы карэнь... гэтых тэорый, паказаўшы, што ...нал-дэмократы цалкам адбіва... інтарэсы кулака і ў БССР ...яюцца агентурай польскага ...шызму.

...хровая групоўка буржуазных ...лігентаў нацыянал-дэмократаў ...алася ў нераважнасьці з бы... міністраў БНР, якія у свой час ...галі на заваёвы Кастрычніка—...уліся стварыць пад шыльдай ...арускай Народнай Рэспублікі» ...ржуазна-фашысцкую Беларусь. ...зьбітыя пролетарыятам і выкі... за межы контррэволюцыянэ... ...казалі, што бальшавікі «адума...», што савецкая ўлада пераро...ла.

«Савецкі Ўрад Беларусі—як гаво... ... сёньняшняе паведамленьне ...—у свой час дазволіў зьвярнуц... з эміграцыі раду асоб, маючы на ... іх запэўніваньні добрасумлен... і аддана працаваць у інтарэсах ...кага будаўніцтва. Сапраўды-ж ... асобы, выкарыстаўшы аказа... ім давер'е, працягвалі сваю ...рэволюцыйную дзейнасьць у зго... з замежнымі буржуазнымі нацыя...-фашысцкімі арганізацыямі і па ... указаньнях».

...юзе з польскім фашызмам яны ...куючыся нізрынуць дыктатуру пролетарыяту—выратаваць эксплёататарскія клясы—зьдзейсьніць мэты беларускай і сусьветнай буржуазіі.

Ластоўскі, Краскоўскі, Лёсік і інш. вядомы працоўным як заўзятыя ворагі. Ніхто іншы, як яны, разам з бандамі Балаховіча наладжвалі пажарышчы мястэчак, вёсак і гарадоў Беларусі, яны оптам і ў розніцу прадавалі працоўныя масы.

Карыстаючыся аказаным давер'ем Савецкага ўраду, пад маскай лояльнасьці, гэтыя буржуазныя інтэлігенты, праціснуўшыся на навуковую работу ў Акадэмію Навук і інш. кіруючыя пасты ўсімі мерамі імкнуліся працягнуць сваю варожую ідэолёгію. Яны ідэолізавалі «самабытную» Беларусь, стараючыся замазаць заваёвы і посьпехі Кастрычніка, адарваць БССР ад усяго Саюзу і організаваўшы буржуазна-фашысцкую рэспубліку падпарадкаваць «культурнаму» панаваньню катаў пілсудчыны.

Праз вядомую прышчэпаўшчыну яны бралі стаўку на кулака, усімі мерамі перашкаджаючы колектывізацыі імкнуліся павярнуць на капіталістычны шлях разьвіцьцё вёскі.

Нацыянал-дэмократы, як гэта відаць па рабоце раду савецкіх устаноў НКА (пры Ігнатоўскім і Баліцкім), БДВ (пры Жылуновічы і Шыпіле); НКЗ (пры Прышчэпаве, Адамовічу А.), Інбелкульт і потым БАН (пры Ігнатоўскім) мелі сурёзны уплыў на лінію гэтых устаноў, прыводзячы ня толькі да скажэньня лініі партыі ў гэтых установах, але ... да поўнай падмены лініі партыі нац.-дэмаўскай практыкай. Галоўныя свае намаганьні нацыянал-дэмакраты накіроўвалі на захват у свае рукі работу ў галіне культуры і сельска-гаспадарчай экономікі.

Разгортваючы сваю шкодніцкую дзейнасьць, нацыянал - дэмократы (што асабліва трэба падкрэсьліць) праяўлялі вялікую стараннасьць у справе прасоўваньня сваіх шчупальцаў у навучальныя ўстановы і з той мэтай, каб накіроўваць выхаваньне моладзі па патрэбным ім нацыянал-дэмократычным рэчышчы.

Удзельнікі контр-рэволюцыйнай групоўкі вядомыя шырокім працоўным масам, як ворагі пролетарскай дыктатуры, не ... ... і ня мелі ніякай падтрымкі з боку рабочай клясы і асноўных мас сялянства. Яны, як і да іх падобныя, выкрытыя раней шкодніцкія контррэволюцыйныя організацыі, **асноўныя надзеі ўскладалі на інтэрвэнцыю.**

Маючы непасрэдную сувязь з прадстаўнікамі беларускага нацыянал-фашызму ў Заходняй Беларусі, узгадняючы з імі сваю дзейнасьць і атрымліваючы ад іх дырэктывы, контррэволюцыйная група нацыянал-дэмократаў стала рупарам польскага фашызму—агентам інтэрвэнцыі.

Вядучы рашучае змаганьне з нацыянал-дэмократызмам і нацыянал-опортунізмам, партыя яшчэ раз падкрэсьліла, што **«рукамі нацыянал-опортуністых дзейнічае клясавы вораг».** Нацыянал-опортуністыя зараз ня толькі агенты нацыянал-дэмократызму, але-ж аказаліся яны тымі-ж самымі нацыянал-дэмократамі толькі з партбілетам у кішэні.

Правыя і «левыя»-опортуністыя, бязпрынцыпны двурушніцкі права-«лявацкі» блёк Сырцова—Ломінадзе, нацыянал-опортуністыя, якія па сутнасьці былі агентамі беларускіх нацыянал-дэмократаў, палегчылі работу контррэволюцыянэрам-шкоднікам — расчышчалі дарогу для іх падрыўнай дзейнасьці.

Як работа правых і «левых» опортуністых і двурушнікаў, якіх партыя вікідвае вон з сваіх шэрагаў так і дзейнасьць нацыянал-опортуністых, якая прызнана Кастрычніцкім пленумам КП(б)Б нясумяшчальнай з прабываньнем у партыі—нязадольны супыніць бальшавіцкіх тэмпаў нашай будоўлі.

Выкідваючы гэтых агентаў клясавага ворага вон, партыя ўсё больш мацуе свае шэрагі, пашыраючы іх за лік новых дзесяткаў і соцен перадавых рабочых, ударнікаў.

Наперакор шкодніцкай контррэволюцыйнай дзейнасьці Рамзіных, Ластоўскіх і да іх падобных, наперакор панікёрскім верашчаньням опортуністых усіх масьцей, партыя і пад яе кіраўніцтвам пролетарыят ўсе працоўныя з яшчэ большай упартасьцю будуць ажыцьцяўляць генэральную лінію, накіраваную на бальшавіцкія тэмпы індустрыялізацыі СССР, на соцыялістычную перабудову сельскай-гаспадаркі, на разгорнуты соцыялістычны наступ на капіталістычныя элементы гораду і вёскі па ўсяму фронту, ажыцьцяўленьне політыкі лікеідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі.

Непрымірымая барацьба з правым ухілам, двурушніцтвам, як галоўнай небясьпекай, з «левымі» загібамі і прымірэнцтвам да іх, зьяўляецца асноўнай умовай пасьпяховага будаўніцтва соцыялізму.

Комуністычная партыя, пад яе кіраўніцтвам комсамол і ўсе працоўныя надалей з яшчэ большай упартасьцю будуць ажыцьцяўляць ленінскія прынцыпы нацыянальнай політыкі, як адзіна правільнай, забясьпечваючай сапраўдны ўздым экономікі і культуры прыгнечаных царызмам нацый.

Ажыцьцяўленьне задач нац.-політыкі партыі, будаўніцтва нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зьместу культуры патрабуе яшчэ большай барацьбы з нацыянальнымі ўхіламі, канцэнтруючы галоўны агонь на вялікадзяржаўным расійскім шовінізьме які яўляе зараз галоўную небясьпеку, імкнучыся пад шыльдай інтэрнацыяналізму рэвізаваць асновы ленінскай нац.-політыкі. Сэнс з гэтага ўяўнага інтэрнацыяналізму заключаецца ў тым, што пад яго шыльдай вялікадзяржаўныя шовіністыя імкнуцца аднавіць панаваньне нізрынутай расійскай «бацькаўскай» буржуазіі.

Гэта набывае тым большае значэньне, што партыя павінна паралізаваць усялякія спробы вялікадзяржаўнага шавінізму, скарыстаць выкрыцьцё і арышт контррэволюцыйнай нацыянал-дэмократычнай групы для свайго рэвваншу.

Выкрыцьцё і арышт контррэволюцыйнай групы ня толькі не зьнімае з парадку дня змаганьня з нацыянал-дэмократызмам, а наадварот—патрабуе ад партыі і комсамолу яшчэ больш рашучага ажыцьцяўленьня ленінскай нацполітыкі, бязьлітаснага змаганьня з нацыянал-дэмократызмам і ...ымі шовінізмамі, узмацненьня работы па беларусізацыі.

У адказ на клясава варожую дзейнасьць контррэволюцыйнай міністэрскай групы працоўныя БССР, комсамольская організацыя з яшчэ большай упартасьцю будуць змагацца за ажыцьцяўленьне ленінскай нацполітыкі, узмацненьне абароназдольнасьці краіны—разгортваньне бальшавіцкімі тэмпамі індустрыялізацыі, упартае правядзеньне суцэльнай колектывізацыі і на гэтай аснове лікеідацыі кулацтва як клясы, вядучы рашучую барацьбу з правым і «левым» опортунізмамі і іх рознавыгляднасьцю, нацыянал-опортунізмам—узмацняючы гэтым самым **магутнасьць першай краіны будуючагася соцыялізму.**

Буржуазны суд „выхоўвае“ піонэраў

15-гадовы піонэр Гарры Айзман быў арыштаваны за ўдзел у дэмонстрацыі ньюёрскіх беспрацоўных у пачатку сакавіка гэтага году. Буржуазны суд прыгаварыў яго да 5 год прымусовага выхаваньня з высылкай за межы ПАЗШ.

Пад націскам комсамольскіх організацый і рабочых гораду Нью-Ёрку, тав. Айзман гэтымі днямі вызвален з выхаваўчага дому, з умовай безадкладна выехаць заграніцу. У гонар яго вызваленьня комсамольцы, сумесна з піонэрамі, організавалі масавы мітынг рабочай моладзі. Тав. Айзман атрымаў ад савецкіх піонэраў запрашэньне прыехаць у СССР.

БАРАЦЬБА ЗАРУБЕЖНАГА КОМСАМОЛУ

Лісты з-за мяжы

АТРАДЫ ПОЛІЦЭЙСКІХ „УЦІХАМІРВАЮЦЬ БУНТАРОЎ“

Дубінкі, тэрор супроць забастоўкі вучняў на фабрыцы Флёра

„Салдаты узьнялі над казармай чырвоны сьцяг“

Поліцэйскі тэрор супроць бастуючай моладзі

Нядаўна ў Бэрліне забаставалі вучні фабрыкі „Флёра“. Для разгрому стачкі дырэкцыя фабрыкі, сумесна з майстрамі і поліцыяй, ужыла новыя способы барацьбы.

Вакол прадпрыемстваў былі ўстаноўлены пасты поліцэйскіх і шпікаў, да якіх былі прыстаўлены майстры фабрыкі. Аж да бліжэйшага вакзалу цягнуўся ланцуг жандармэрыі. На вуліцах, якія вядуць да фабрыкі, рух быў спынен. Па ўсім прылягаючым да фабрыкі раёне разьяжджалі поліцэйскія патрулі на ваЛёсыпэдах. Забастовачныя пікеты падлеткаў разганяліся. Калі на вуліцы зьбіралася больш 3 чалавек, ім прапанавалася неадкладна разыйсьціся. Хто не жадаў гэтага зрабіць, быў зьбіты гумовымі дубцамі. Гэтымі захадамі поліцыі ўдалося захапіць некаторую частку забаставаўшых і сагнаць іх на фабрыку.

Комсамольцы Бэрліна на поліцэйскі тэрор адказваюць умацненьнем чырвонай аховы перад фабрыкай.



Пахаваньне забітага поліцыяй у Лейпцыгу чырвонага франтавіка.

Як фашызм рыхтуе „пушачнае мяса“

Італьянскія фашыстыя стараюцца выхаваць у дзец...х, асабліва пролетарскіх, „патрыотызм“ і вернасьць „італьянскаму сьцягу“. Для гэтай мэты ў Італіі ўтворана асобая дзіцячая організацыя „Балілла“.

„Балілла“ ахоплівае дзяцей ва ўзросьце ад 6 да 14 год і лічыцца добраахвотнай організацыяй. На самой-жа справе маладыя фашыстыя самымі жорсткімі сродкамі прымушаюць дзяцей працоўных ісьці ў іх шэрагі, ужываючы тэрор і запалохваньне.

У шэрагах „Балілла“ шырока выслаўляецца фашысцкая „рэволюцыя“ і „гэройскія ўчынкі“ фашысцкага верхавода Муссоліні. У асобай малітве („Балілла“ мае сваю асобую малітву) зьмяшчаецца просьба да бога, каб ён „захаваў караля і Муссоліні“ і каб „італьянскі сьцяг веяў ня толькі ў Італіі, а і ва ўсім сьвеце“.

Так фашыстыя, пад прыкрыцьцём рэлігіі, праводзяць агітацыю за італьянскі імпэрыялізм. Праз газэту „Балілла“ фашыстыя вядуць шалёна цкаваньне Савецкага Саюзу, расказваючы страшныя казкі і гісторыі аб „галадаючых дзецях у Расеі“ і аб „зьбіеньні бальшавікамі дзяцей да сьмерці“.

У програме „Балілла“ галоўную ролю мае военная і фізычная падрыхтоўка падлеткаў, з якіх фашызм рыхтуе сабе верных слуг і пушачнае мяса.

Распальваньнем нацыянальнай розьні буржуазія імкнецца адцягнуць працоўных ад клясавай барацьбы

Грэцкая буржуазія, імкнучыся адцягнуць працоўных ад клясавай барацьбы, якая ўсё абвастраецца, распальвае нацыянальную розьнь сярод пасобных народаў, якія насяляюць краіну. Адзін з способаў такога „выхаваньня“—„нацыянальныя“ сьвяты. На гэтых сьвятах падкупленыя буржуазныя прамоўцы гавораць аб „адзінстве нацыі“, аб тым, што і багатыя і бедныя павінны ўяўляць адно цэлае. У той-жа час яны пад рознымі прадлогамі вядуць цкаваньне супроць другіх нацыянальнасьцяй.

Але працоўныя, пад кіраўніцтвам компартыі, пачынаюць ясна адрозьніваць свайго сапраўднага ворага і, не гледзячы на арышты і зьбіеньні, пачынаюць ператвараць нацыянальныя сьвяты ў рэволюцыйныя выступленьні.

Так гэтымі днямі ў грэцкім горадзе Прэвэза ў час нацыянальнага сьвята рабочая моладзь, пад сьпевы рэволюцыйных песень, распаўсюджвала комуністычныя лятучкі. У знак солідарнасьці салдаты паднялі над казармай чырвоны сьцяг.

Поліцыя напала на дэмонстрантаў, 10 рабочых і 2 салдаты былі неадкладна арыштаваны.

ЯК ФАШЫСЦКІ ЎРАД УТВАРЫЎ ПАТРЭБНЫ ЯМУ ФАШЫСЦКІ ПАРЛЯМАНТ

За час прадвыбарнай кампаніі ў Польшчы было арыштавана 5000 чал.

На Зах. Украіне і Зах. Беларусі былі забаронены ўсякія сходы і мітынгі і опэрыравалі карныя экспэдыцыі.

„Выбары" пад сьвіст бізуноў

(Ліст з Варшавы)

Нядаўна ў Польшчы адбыліся выбары ў соймі (польскі парлямант). Большасьць галасоў на выбарах і большасьць дэпутацкіх месц (248 на 444) у новым парляманце атрымалі прыхільнікі фашысцкага ўраду, але гэта зусім ня сьведчыць аб сіле польскага фашызму. Наадварот, уся абстаноўка выбараў з найвялікшай відавочнасьцю паказала ўнутраную слабасьць фашысцкай улады ў Польшчы.

„Польшча,—пісаў нядаўна вядомы польскі буржуазны палітычны дзеяч Цмоўскі,—знаходзіцца ў стане выключна цяжкога гаспадарчага крызісу". Крызіс цягнецца ўжо два гады. За гэты час вытворчасьць прамысловасьці скарацілася на 40 процантаў. Зарплата рэзка ўпала,—польскі рабочы зарабляе зараз у сярэднім 100 злотых (менш 25 руб.) у месяц, пры 10-12 гадзінным рабочым дні. Беспрацоўе пагражаюча расьце. Зараз у Польшчы ня менш 750 тысяч беспрацоўных, асуджаных на жабрацтва і голад. У вёсцы абшарніцкая эксплёатацыя і рабаўніцтва ўлады давялі працоўнае сялянства да нячуванага абяднення. Асабліва цяжка пад пятою польскага фашызму сялянству Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі (часьці Украіны і Беларусі, гвалтоўна ўключаныя ў склад Польшчы).

Нацыянальны ўціск, жандарскі разгул, бязьлітасная эксплёатацыя гарадзкога пролетарыяту і разбурэньне сялянства прысьпешылі ўздым рэволюцыйнай барацьбы ў Польшчы. Стачкі, паўстаньні ахапілі горад і вёску. На Заходняй Украіне запалалі абшарніцкія маёнткі. Пачаліся партызанскія выступленьні даведзенага да адчаю сялянства—супроць абшарнікаў, паліцыі і польскай улады.

Бурны размах рэволюцыйнай барацьбы моцна ўстрывожыў польскую буржуазію і абвастрыў склоку ў яе шэрагах. Прадстаўнікі сярэдняй і дробнай буржуазіі сталі дакараць Пілсудзкага (фашысцкі дыктатар Польшчы), што яго палітыка абвастрае гаспадарчы крызіс у краіне і ўзмацняе небясьпеку рэволюцыі. Цэнтрам гэтых выступленьняў супроць ураду стаў сойм.

Парлямант стаў перашкодай Пілсудзкаму на шляху далейшай фашызацыі Польшчы, яшчэ больш лютага ўціску рэволюцыйнага руху, яшчэ больш узмоцненай падрыхтоўкі вайны супроць СССР.

Пілсудзкі парашыў таму расплаціцца з сваімі парляманцкімі супрацоўнікамі. Ён мог зрабіць гэта альбо разагнаўшы сойм, альбо захапіўшы яго ў свае рукі. Пілсудзкі абраў другі шлях, адкрыта заяўляючы аб неабходнасьці парляманцкага прыкрыцьця фашысцкай дыктатуры.

Два месяцы таму назад Пілсудзкі назначыў перавыбары сойму. Бязупынны паліцэйскі тэрор, арышты, катаваньні, забойствы і самае адкрытае ашуканства былі пушчаны ў ход для таго, каб атрымаць рашучую большасьць дэпутацкіх месц.

За час прадвыбарчай кампаніі ў Польшчы было арыштавана каля 5 тысяч чалавек (для параўнаньня скажам, што да прадвыбарчай кампаніі ў польскіх турмах налічвалася прыблізна 6 тысяч палітычных зьняволеных). У адной Варшаве, у працягу двух прадвыбарных дзён было арыштавана 250 рабочых і зачынена 6 рэволюцыйных профсаюзных арганізацый. На Заходняй Украіне і ў Заходняй Беларусі былі забаронены ўсялякія сходы і мітынгі. Ва ўкраінскіх вёсках польскія кавалярыстыя бізувамі вымагалі ў сялян абавязацельства галасаваць за прыхільнікаў ураду. Усіх падазроных у тым, што яны вязуць у выбарчую камісію кандыдацкія сьпісы рэволюцыйнага рабоча-сялянскага саюзу, зьнімалі з цягнікоў, з аўтобусаў, з пад од, арыштоўвалі і адбіралі сьпісы.

У дзень выбараў цэлыя вёскі былі пастроены паліцыяй у калёны і пад ваенную музыку прыведзены да выбарчых урнаў (скрыня, куды спускаюцца пісулькі з указаньнем кандыдацкага сьпісу, за які галасуюць), прымушаючы ўсіх галасаваць за сьпіс № 1—урадавы.

У гарадох фашысцкія банды пагражалі рабочым збойствам, калі яны будуць падаваць свае галасы за рэволюцыйны рабоча-сялянскі сьпіс. У дадатак да гэтага, яшчэ да галасаваньня, выпадкова, было выкрыта 700 такіх фальшывых пісулек. У другой урне аказалася 2434 пісулькі, хаця галасавала 1425 чалавек. Масавыя злоўжываньні былі дапушчаны і пры падліку галасоў.

У выніку фашысцкі ўрад атрымаў патрэбны яму фашысцкі парлямант. Але, з другога боку, выбары паказалі і значнае ўзмацненьне рэволюцыйнага лягеру ў Польшчы.

У Варшаве цэлыя заводы, ня лічачыся з прасьледваньнямі, давалі свае подпісы пад рэволюцыйнымі кандыдацкімі сьпісамі. У Заходняй Беларусі, ня гледзячы на процідзеяньні паліцыі, удалося адабраць больш 8 тысяч подпісаў (неабходны для зацьвярджэньня сьпісу перад выбарамі). Ва ўсіх вёсках адбываліся масавыя „за бароненыя" мітынгі і дэмонстрацыі, кіруемыя падпольнай компартыяй. Для рабочых і сялян удзел у выбарах ва ўмовах тэрору быў толькі палітычнай дэмонстрацыяй супроць фашызму. І яны пашлі на гэтую дэмонстрацыю з вялізнай самаадданасьцю, праяўляючы глыбокую адданасьць рэволюцыйным лёзунгам і высокую палітычную сьвядомасьць.

Ня гледзячы на зьверствы і ашуканствы ўлады, рэволюцыйнаму пролетарыяту ўдалося паслаць у парлямант 5 сваіх прадстаўнікоў. Але яшчэ значна важней тое, што выбарчая барацьба дала магутны штуршок мобілізацыі рэволюцыйных сіл у Польшчы.

„Ідзеце масай на выбары з думкаю аб узброеным паўстаньні",—заклікала польскі пролетарыят комуністычная партыя. Яе заклік быў пачуты. Уся абстаноўка выбараў гаворыць аб прыбліжэньні рэволюцыйных бур у Польшчы.

А. Вольскі.

СПРАВА „ПРАМЫСЛОВАЙ ПАРТЫ

„НА ЗАУТРА-Ж, ПАСЬЛЯ ПЕРАВАРОТУ, ПАВІННА ПАЧАЦЦА КРЫВАВАЯ РАЗАНІНА РАБОЧАЕ КЛЯСЫ"

--марылі шкоднікі, шпіёны і здраднікі з „прамысловай парты

Але мары шкоднікаў і інтэрвэнтаў разьбіліся аб няпрыступную сьцяну пролетарыяту, які пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі будуе соцыялізм

З паказаньняў падсуднага Ачкіна.

Я, заяўляе Ачкін, прызнаю сябе вінаватым ва ўсіх зробленых мною злачынствах, аб якіх гаворыцца ў абвінавачым заключэньні. Па сваёй рабоце ў Тэхнічным Інстытуце і па ролі, якую ён адыгрываў пры зносінах ЦК прампартыі з Француцкімі агэнтамі ў Маскве К. і Р., падсудны быў блізкай асобай да Рамзіна.

Ачкін дапаўняе паказаньні Рамзіна і Ларычава. Сілы шкоднікаў былі накіраваны ня толькі на тое, каб развaліць работу ў Данецкім і Кузьнецкім басэйне, але таксама і на тое, каб затрымаць пераход на мясцовы апал. Не шкадавалі сваіх сіл шкоднікі з „Прампартыі", каб спыніць работу па рацыяналізацыі, затрымаць падрыхтоўку кадраў і рэалізацыю каштоўных навуковых вынаходак.

У барацьбе з савецкай уладай „Прампартыя" не магла разьлічваць на свае сілы. Яна не магла не зразумець і таго, што нават з дапамогаю ЦКП ёй не дабіцца сваіх мэт. Таму яна прышла да наступных установак: весьці дывэрсыйную работу з тым, каб падрыхтаваць спрыяльную для інтэрвэнцыі глебу, устанавіць шчыльную сувязь з замежнымі контррэволюцыйнымі коламі.

Канчае свае паказаньні Ачкін указаньнем на тое, што прампартыя з кожным днём пераконвалася, у немагчымасьці вырашыць свае задачы, у тым, што яе разьлікі разбурыць узрастаючы энтузіязм рабочае клясы і посьпехі соцбудаўніцтва пацерпяць крах.

Як Архімэд шукаў пункту апоры для таго, каб перавярнуць увесь сьвет, так і прампартыя шукала вагара, каб дамагчыся сваіх мэт. Гэткім вагаром для яе зьявілася шкодніцтва і інтэрвэнцыя.

З паказаньняў падсуднага Сітніна

Апошнім дае паказаньні падсудны Сітнін. Ён, як і іншыя падсудныя, поўнасьцю прызнае сваю віну.

У тэкстыльным сындыкаце ў аддзеле забясьпечаньня баваўнай Сітнін праводзіў шкодніцкую работу. Разам са шкоднікамі з гал ўбаваўны ён імкнуўся ствараць перацэўвялічаныя пляны, што выклікала дыспропорцыю ў тэкстыльнай прамысловасьці. Шкоднікі перашкаджалі ўвядзеньню на тэкстыльных фабрыках бесьперапынкі і амэрыканскіх мэтадаў работы.

Сітнін сазнаецца, што на яго сумленьні ляжыць яшчэ адно шкоднае дзеяньне. Ён зьявіўся дзейным супрацоўнікам Фядотава па ажыцьцяўленьню опэрацый з ангельскімі фірмамі, якія давалі шкоднікам паўпроцанта куртажу (факторства). Гэты вопыт быў прароблены Сітніным у Амэрыцы. Ён дагаварыўся з некаторымі фірмамі, каб яны рабілі адлічэньні на карысьць шкоднікаў. Гэтыя адлічэньні, па словах Сітніна, дасягалі да 100000 рублёў у год. Едучы назад з Амэрыкі, Сітнін затрымаўся ў Парыжы, дзе спаткаўся з кіраўнікамі Гандальпрому Ад іх ён атрымаў інформацыю аб падрыхтоўцы інтэрвэнцыі ў СССР.

**

Пасяджэньне Вярхоўнага суда СССР аднаўляецца а 6 гадзіне ўвечары 28-га лістапада. Суд зацьвярджае плян далейшага вядзеньня судовага сьледзтва, прапанаваны прокуратурай і падтрымані абаронаю. Плян гэты, між іншым, прадугледжвае ўстанаўленьне фактаў перагавораў аб падрыхтоўцы да інтэрвэнцыі, меўшых месца ўжо ў 1930 г., пасьля арышту падсудных па гэтай справе. Спэцыяльнае закрытае пасяджэньне суда будзе прысьвечана ўстанаўленьню асоб агэнтаў француcкай службы, фігуруючых ў абвінавачым заключэньні пад ініцыяламі К. і Р. На тым-жа пасяджэньні будуць разгледжаны і іншыя пытаньні, зьвязаныя са шпіёнскай работай ЦК прампартыі і агэнтурай француcкага генштабу.

Допыт падсуднага Рамзіна

Першым дапытваецца падсудны Рамзін. Ён дае суду кароткія весткі з сваёй біографіі. Ён нарадзіўся ў 1887 годзе ў сямьі сельскага настаўніка. Па сканчэньні тамбоўскай гімназіі паступіў у МВТУ, пры якім быў застаўлен асьпірантам для падрыхтоўкі да навуковай дзейнасьці. Кастрычнікавую рэволюцыю сустрэў надзвычайна варожа, стаўшы адразу-ж у шэрагі сабатажнікаў. На позіцыях поўнага сабатажу ён трымаўся да 1921 г. Пэрыод шкодніцкай дзейнасьці пачаўся тады, калі ён страціў надзею на пераражэньне савецкай улады, калі пачаўся рэконструкцыйны пэрыод, калі пачалося соцыялістычнае наступленьне. У пачатку 1927 г. у Рамзіна ў дзяржпляне адбылася першая адкрытая гутарка з Пальчынскім, Рабіновічам і Ларычавым аб шкодніцкай арганізацыі і ўсіх задачах, якія яна сабе ставіць. Закаранелыя шкоднікі „давялі" Рамзіну, што экономічны, а разам з тым і палітычны крах савецкай улады зусім непазьбежны. Высьвятляецца, што падсудны вёў контррэволюцыйную работу аж да самага арышту. Рамзін імкнуўся пераканаць суд у тым, што ў апошні час у яго пачаліся „хістаньні" ў правільнасьці яго шкодніцкіх установак. Аднак, т. Крыленка шэрагам пытаньняў прымушае Рамзіна прызнаць, што гэтыя „сумненьні" не перашкодзілі яму весьці контррэволюцыйную работу да апошняга моманту яго прабываньня на волі. На гэтым канчаецца допыт Рамзіна.

Допыт Ларычава

Кастрычнікавая рэволюцыя застае Ларычава на пасту намесьніка ўпаўнаважанага па апалу ўсемаскоўскай вобласьці з кругленькім акладам у 1000 руб. у месяц. Пасьля ўстанаўленьня савецкай улады на Украіне Ларычаў прабіраецца на адказныя пасады аж да пасады раённага ўпаўнаважанага кіраўніцтва вугальнай прамысловасьці. У жніўні 1922 г. Ларычаў перабіраецца на работу ў Маскву. Пад напорам допыту дзяржаўнага абвінаваўцы і членаў суда Ларычаў аказваецца вымушаным расказаць, што ў Маскву яго пацягнула ня імкненьне аддаць свае сілы справе соцыялістычнага будаўніцтва, праводзімага савецкай уладай, а надзеі на буржуазнае перараджэньне савецкай улады на рэйках новай экономічнай палітыкі. Далей падсудны Ларычаў падцьвярджае, што ён і „прампартыя" разьлічвалі, што на другі дзень пасьля контррэвалюцыйнага пера[...] непазьбежна павінна ўстанавіц[...] енн я дыктатура і адбудзецца [...] вая расправа буржуазіі з [...] клясай.

Допыт падсуднага Ка[...] нікава

— Ваенная дыктатура непа[...] прывяла-б к беламу тэрору,—[...] Калінінікаў на пытаньне суда [...] еннай дыктатуры. Пры пера[...] тэрвэнцыі абавязкова накінул[...] тых, хто разьвіў і падтрымлі[...] вецкую ўладу, г. зн. на рабоч[...] напорам настойлівых допытаў [...] шынскага, Калінінікаў вымуш[...] прызнаць і другую азбучную [...] што аполітычнасьць, у якой бы[...] прабываў падсудны, па сутнас[...] ла, як выразіўся старшыня, [...] тычнасьцю палітычнай". К[...] каў-жа сам заявіў суду, што [...] махровым кадэтам і да самага [...] ту антысавецкі настроен. Ка[...] адышоў ад кадэцкай партыі [...] ён гаворыць,—„падвёў", дык [...] таму, што гэтая партыя не зма[...] рамагчы ў кастрычніку паў[...] пролетарыят.

Паказаў сябе Калінінікаў і ў [...] нах вышэйшага тэхнічнага вуч[...] дзе ён організаваў акадэмічну[...] стоўку, якая была накіравана [...] сав. улады. Займаў ён ня м[...] стоў. Ён быў ня толькі проф[...] ваенна-паветранай і горнай [...] але і членам тэхнічнага саве[...] Галоўмэтал, членам навуковай [...] сіі НТУ, членам камітэту дзяр[...] заказаў, членам тэхнічнага [...] Гіпромезу. Папаў ён у Дзяр[...] дзе займаў пасаду старшыні [...] словай сэкцыі. Настолькі выс[...] вер'е яму было аказана, Ка[...] выкарыстаў для організацыі [...] га шкодніцтва, складаючы пля[...] мысловасьці, а таксама сьпіс[...] сыйных об'ектаў з такім ра[...] каб падарваць індустрыялізац[...] ны і гэтым сыграць на руку [...] вэнтам.

У АДКАЗ ІНТЭРВЭНТАМ

Узмацняем абарону

МАСКВА, 28. Адбыўся мітынг работнікаў навукі, літаратуры і мастацтва, організаваны ўсесаюзнай грамадой культурнай сувязі з заграніцай. У прынятай рэзолюцыі савецкія навуковыя работнікі і дзеячы мастацтва зварочваюцца да сваіх зарубежных братоў з заклікам усімі сіламі прапівадзейнічаць інтэрвэнцкім плянам міжнароднай рэакцыі.

У заключэньне мітынг зварочваецца з гарачым прывітаньнем к Чырвонай арміі і заяўляе, што навуковыя работнікі і дзеячы мастацтва аддадуць усе свае сілы і веды для ўмацаваньня абароны краіны.

На апошнім пасяджаньні камітэту па дырыжаблябудаўніцтву вырашана правесьці з 25 сьнежня па 20 студзеня ўсесаюзны „дзень дырыжабля". На працягу гэта[...] міну „дзень дырыжабля" праведзен ва ўсіх раёнах СС[...]

К 21-му лістапада агульн[...] ма падпіскі на пазыку „пя[...] па Саюзе дасягла 717,5 м[...] рублёў, што складае 89,7 пр[...] рольнай лічбы. Па РСФСР ка[...] ная лічба выканана на 90,2 [...] па СССР—на 88,8 проц., па УСС[...] —на 98,8 проц., па [...] 86,2 проц., па Узбэкіста[...] 100,2 проц., па Туркмені[...] 102,2 проц. і па Таджыкі[...] на 95,2 проц. Сярод рабо[...] служачых кантрольная ліч[...] алізацыі пазыкі выканана [...] юзе, з перавышэньнем на 5,[...] Падпіска сярод сялянства [...] Саюзе 150,5 мільёнаў рубл[...] складае ўсяго 60,2 проц. ка[...] най лічбы.

Уступаем ва ўдарныя брыгады


ЧЫСЬЦЯКОЎКА, 28. Гарнякі Чысьцякоўшчыны ў адказ ш[...] кам з „прампартыі" уступаюць ва ўдарныя брыгады для ліквi[...] прарыву. Інжынэры і тэхнікі шахты „Капітальная" патрабуюць [...] стрэлу шкоднікаў. Выступіўшы на сходзе інжынэр Краўцоў [...] „Лепш расстраляць Рамзіных і Калінікавых, чым цягнуць міль[...] масы працоўных у новыя войны".

Патрабуем расстрэлу—шкоднікаў

КРАМЯНЧУГ, 28. У дэмонстрацыі, у сувязі з процэсам „прампартыяй", удзельнічала звыш 10.000 рабочых і інжынэрн[...] нічнага пэрсоналу мясцовых фабрык і заводаў. Усе яны адна[...] патрабавалі вышэйшай меры соцыяльнай абароны для шкодні[...] „прампартыі" і хадайнічалі аб узнагародзе АДПУ ордэнам Леніна.

Стаць на абарону Савецкага Саюзу

ЛЁНДАН, 28. У сувязі з процэсам „промпартыі" ангельская компартыя апублікавала адозву да ангельскага пролетарыяту, у якой заклікае яго стаць на абарону Савецкага Саюзу. „Процэс прампартыі, — гав[...] ў адозьве,—выкрывае ваенн[...] вор француcкага і ангельска[...] даў і паказвае, што небя[...] вайны зьяўляецца грозна[...] існасьцю".



На трамаўскім фронце-прарыў

НКА, Галоўмастацтва, НКФ, ЦСПСБ і комсамольскія організацыі адвярнуліся ад ТРАМ'аў

ТРА'М патрабуе:

САПРАЎДНАГА КІРАЎНІЦТВА І ЎВАГІ;
УКЛЮЧЭНЬНЯ Ў ДЗЯРЖБЮДЖЭТ;
ПЕРАВОДУ ТРАМ'АЎЦАЎ НА РАНІШНЮЮ ЗЬМЕНУ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ;
СТВАРЭНЬНЯ НЕАБХОДНЫХ УМОЎ ДЛЯ РАБОТЫ;
ДАПАМОГІ БЕЛ. АПП'у, ДРАМАТУРГАЎ, ГАЛОЎМАСТАЦТВА ЦСПСБ.

Мастацкі агітпроп комсамолу павінен стаць на чале самадзейнага мастацтва ў першыя шэрагі барацьбітоў за генэральную лінію партыі у нацкультбудаўніцтве

Комсамол патрабуе ад ТРАМ'у:

ШТОДЗЁННАЙ СУВЯЗІ З КОМСАМОЛАМ;
АДЛЮСТРАВАНЬНЯ Ў СВАЁЙ ПРОДУКЦЫІ ЗАДАЧ ОРГАНІЗАЦЫІ;
ДАПАМОГІ Ў СТВАРЭНЬНІ АГІТ-ПРОПБРЫГАД НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ;
УПАРТАГА БУДАЎНІЦТВА ПРОЛЕТАРСКАГА ТЭАФРОНТУ;

Ня словам пустым і ня крыкам, а справаю дапамагчы ТРАМ'у

[Н]екалькі заўваг да нарады аб становішчы ТРМА'аў

[С]амадзейнае мастацтва зьяўляецца [ма]гутным сродкам у справе перавы[хов]аньня шырокіх мас, укараненьня [ў іх] ідэй соцыялістычнага будаўніцтва, [нов]ага быту і комуністычнай моралі. Яно [ста]ло разьвівацца на Беларусі нядаўна [...] таму назад з груп энтузіястых за[чын]нікаў быў створан тэатр рабочай [мо]ладзі.

[Т]РАМ—гэта тэатр соцыялістычнага [тып]у, які поўнасьцю адказвае нашым [па]трабаваньням. ТРАМ — буйны [здабыт]ак моладзі ў нацыянальна-культур[ным] будаўніцтве БССР.

[У]ся грамадзкасьць, у асаблівасьці [ком]самол, у праве былі чакаць вялі[кіх] рэальных вынікаў ад яго работы. [Цяпер] ужо можна падвесьці некато[рыя] вынікі.

[Н]я гледзячы на шэраг праведзеных [ТРА]М'ам мерапрыемстваў, ён да гэ[тага] часу не ўвайшоў у плоць і кроў [рабоч]ай моладзі, недастаткова адбівае [бурн]ыя тэмпы нашага жыцьця. У [скла]дзе ТРАМ'у—комсамольцы, рабо[чая] энэргічная, таленавітая моладзь. [Ён], бязумоўна, мае магчымасьць спра[віцц]а з ускладзенымі на ТРАМ зада[чамі].

[Ал]е... Наркомасьветы амаль не ад[дае] ўвагі разьвіцьцю самадзейнага [мас]тацтва. Галоўмастацтва, юрыдыч[на а]даласуючы за яго, чакае пакуль [хто-н]ебудзь іншы зоймецца стварэнь[нем] сапраўды пролетарскай самадзей[насьц]і, вышэйшай формаю якое зьяў[ляец]ца ТРАМ.

[Ц]СПСБ, у асобе яго культсэктару, [абмя]жоўваецца добрымі пажаданьнямі. [Нар]комфін у парадку „скарачэньня [выда]ткаў“ выкрэсьл ў ТРАМ'аўскі ка[пта]рыс з бюджэту на 1931 год, па[кід]аючыся на „дзядзьку“, які дасьць [ма]гчымасьць ТРАМ'у стаць сапраўд[най] культурнай адзінкай.

[Та]к, у атмосфэры „павароту тварам [да] ТРАМ'у“, жыве і павінен расьці [мас]тацкі агітпроп комсамолу.

[Н]ельга пахваліцца і ўважлівымі ад[носін]амі комсамолу да свайго дзіця[ці]. Да гэтага часу значная коль[касьц]ь комсамольскіх кіраўнікоў не [ус]ьвядомілі вялізарнага палітычна[га] значэньня ТРАМ'у.

[Ча]ста прад'яўляюць хаця зусім [спр]аведлівыя патрабаваньні да ТРАМ'у, [а]ле не аказваюць яму ні[якай] дапамогі. У выніку ТРАМ ня [мо]жа задаволіць запросаў шырокіх [мас] рабочай моладзі.

[Н]ядаўна на Беларусі організаваны [Я]ўрэйскі ТРАМ. Гэтым зроблен знач[ны] крок уперад у пытаньні ажыцьц[яўл]еньня ленінскай нацыянальнай [па]літыкі, — стварэньні пралетарскай [ку]льтуры нацменшасьцяй. Адна[к], лёс [гэт]ага ТРАМ'у ня лепшы беларускага. [Да] гэтага часу вакол яго ня складзе[на] належнай грамадзкай думкі, а Нар[ко]мфін паклаў крыж на каштарыс і [гэ]тага ТРАМ'у.

Пролетарскія пісьменьнікі ў сваёй [ра]боце абсолюна ня зьвязаны з [ТР]АМ'амі, апошнім прыходзіцца ва[ры]цца ва ўласным соку. Творачы но[вы]я пролетарскія рэчы, яны застаюц[ца] без дапамогі такой мошнай органі[заць]ыі як БелАПП.

Нашы нацыянальныя ТРАМ'ы мо[гу]ць і павінны быць актыўнымі ба[ра]цьбітамі з вялікадзяржаўным шові[ніз]мам, галоўнай небясьпекай на да[ным] этапе, з беларускім нацыянал[-дэ]мократызмам і шовінізмамі ўсіх ко[лер]аў—за сапраўдную пролеткультуру. [ТРАМ]'ы ў сваё паўсядзённай ра[бо]це павінны быць лепшымі дапамож[нік]амі комсамольскіх організацый у [пра]вядзеньні генэральнай лініі партыі. [Т]эатры рабочае моладзі могуць [с]правіцца са сваімі задачамі толькі [пры] ўмове практычнай дапамогі і [ўв]агі да іх як з боку комсамолу, так [і] іншых грамадзкіх організацый.

[Н]арада пры ЦК ЛКСМБ па пытань[ню] становішча ТРАМ'аў, якая сёньня [склі]каецца, павінна будзе намеціць [да]лейшыя шляхі разьвіцьця самадзей[н]ага мастацтва на чале з ТРАМ'амі і [па]класьці пачатак павароту ўсіх орга[ніз]ацый, і ў першую чаргу комсамо[л]у, тварам да ТРАМ'аў — мастацкіх [агіт]пропаў комсамолу.

Новае дасягненьне ў пралетмастацтве

У кастрычніку месяцы на Беларусі організаваны яўрэйскі Тэатр Рабочае Моладзі.

У тэатры працуюць 30 чалавек яўрэйскіх рабочых менскіх фабрык і заводаў. ТРАМ прыступіў да практычнай працы. Організаваны 3 сэкцыі: рэжысэрска-акторская, музыкальна-вокальная і кіно-фото-ізо. К першаму студзеня ТРАМ павінен закончыць работу над літаратурным монтажам „13 год Кастрычніка“.

Зараз рэжысэрска-акторская сэкцыя апрацоўвае п'есу „Франты“ з комсамольскага жыцьця. ТРАМ разгарнуў работу па падрыхтоўцы касьцюмаў, конструкцый, бутафорыі і інш.

Організацыя яўрэйскага ТРАМ'у на Беларусі зьяўляецца вялікім дасягненьнем пролеткультуры нацменшасьцяй.

Аднак паасобныя грамадзкія організацыі не ўдзяляюць патрэбнай увагі ТРАМ'у. Так, культаддзел ЦСПСБ і Наркомасьветы адпусьцілі на яго работу ўсяго 1500 рублёў да 1-га студзеня, але мы іх не атрымалі.

Да гэтага часу невядома ці будзе ТРАМ уключан ў бюджэт 1931 году. Кепскае матар'яльнае становішча перашкаджае нам праводзіць у жыцьцё ўсе намечаныя пляны.

Нарада аб ТРАМ'аўскім руху, якая склікаецца сёньня, павінна ўсебакова абгаварыць пытаньні далейшай працы ЯўТРАМ'у і разьвіцьця ўсяго ТРАМ'аўскага руху на Беларусі.

Лебедзеў.

Не дамо зьдзеквацца над ТРАМ'ам

Беларускі ТРАМ створан год таму назад па ініцыятыве групы комсамольцаў—брыгады зацейнікаў Дому Комсамолу.

За гэты год праведзена вялікая работа: 20 выездаў у рабочыя клюбы і ячэйкі, пастаноўка напісанай ТРАМ'аўцамі інсцэніроўкі „Грыўня“, выезд брыгад у колгасы; удзел у манэўрах БВА; колектыўна напісан, аформлен і настаўлен спэктакль „Першы Штандар“—вось актыўны баланс работы ТРАМ'у за гэты год.

А зараз ТРАМ перажывае цяжкі крызіс. Некаторыя актывістыя-трамаўцы (Тарноўскі, Валодчанка) ушлі з ТРАМ'у, некаторыя спужаўшыся цяжкасьцяй апусьцілі рукі.

Работа тэатру замёрла. ТРАМ павінен атрымаць тэрміновую дапамогу комсамолу і ўсёй грамадзкасьці.

Якія прычыны стварылі крызіс?

Да гэтага часу ТРАМ працаваў амаль без кіраўніцтва комсамольскай організацыі. Ні ЦК, ні райкомы, ні ячэйкі жыцьцём ТРАМ'у ня цікавіліся.

Няма ўвагі і з боку савецкіх організацый. Ня ўладжана да гэтага часу пытаньне аб пераводзе ўсіх ТРАМ'аўцаў на ранішнюю зьмену. Хлопцы працуюць у розных зьменах і гэта зрывае работу ТРАМ'у.

ТРАМ яшчэ ня ўключан у бюджэт і жыве ў „паветры“. Пры такім становішчы шмат чаго зрабіць цяжка.

Пролетарская грамадзкасьць і комсамол павінны зламаць закаравеласьць Наркомфіну, Наркомасьветы, недаацэнку ТРАМ'у кіруючымі комсамольскімі організацыямі і стварыць сапраўдны штаб па кіраўніцтву самадзейным рухам у БССР. ТРАМ—мастацкі агітпроп комсамолу.

З. П. З.

Мастацкоры—на баявы вучастак культфронту

На фоне разгорнутага соцыялістычнага будаўніцтва пытаньні афармленьня быту і масавага самадзейнага мастацтва набываюць асабліва важнае значэньне. Ачагі работы над новымі формамі быту, як ТРАМ'ы, масавыя гурткі выяўленчага мастацтва, мастацкія гурткі і консультацыі пры рэдакцыях газэт павінны як найшырэй распаўсюджвацца.

Тэхнічна ўзброіць мастацкораў на прадпрыемстве ў іх паўсядзённай мастацкай рабоце, дапамагчы ім найбольш вернымі, выразнымі, рознастайнымі сродкамі ў афармленьні насьценгазэты, плякату, лёзунгу і іншых рознастайных форм выяўленчага мастацтва павінен гурток мастацкораў, які будзе організаваны пры рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“.

У плян практычнай работы гуртка павінны быць уключаны:

Работа над малюнкам (набросак, і сюжэтная композыцыя), ілюстрацыя допісаў у газэце (карыкатуры);

Барацьба ў галіне малюнку (убіраньне, пасыўны натуралізм і г. д);

Вывучэньне найбольш простых, выразных і дзейных спосабаў фото-монтажу (у насьценгазэце, кнізе, плякаце);

Пабудова плякатаў, барацьба з няверным разуменьнем плякату, формы і мэты плякату (нядзейснасьць, як вынік перагрузкі тэкстам і дэталямі, стракатасьць, неорганізаванасьць композыцыі).

Мастацкораўскі гурток ня можа прайсьці міма факту бясчыннага афармленьня элемэнтаў быту. Актыўнасьць мас, творчая клясавая накіраванасьць павінна быць кінута на фронт мастацтва з мэтай барацьбы за новае, чоткае яго афармленьне. Патрэбна вынесьці з габінэтаў гаспадарнікаў пытаньні стварэньня прадметаў быту на шырокае грамадзкае абгаварэньне і прыцягнуць да справы стварэньня новай пасуды, мэблі, кнігі, этыкеткі і інш., сапраўды шырокія рабочыя масы, апіраючыся на мастацкі актыў.

Гэткім мастацкім актывам павінен стаць гурток мастацкораў, работа якога павінна прыняць самыя конкрэтныя формы: організацыя брыгад па абсьледваньню продукцыі, якую выпускаюць нашыя заводы, організацыя конкурсаў малюнкаў, устанаўленьне баявых задач у афармленьні нашай прамысловасьці, скліканьне вытворча-мастацкіх нарад і інш.

Соцыялізму—найпершы узвод

(Урывак з пастаноўкі БелТРАМ'у „Першы штандар“)

Гучна,
магутна,
проста,
сурова
Зычныя рупары ў далеч грымяць!
„Мы абяцаем—
сэрцам
і кроўю!..
Мы абяцаем—
дагнаць!.. Перагнаць!..
Таварыш рабочы,
туды, дзе п'янкі
Грозна кіруй
жэрлы гармат!
Таварыш рабочы,
— з такімі, як Янкаў,
Ударым
Ударам
Ударных брыгад
Мы, ударнікі, —
моцная зьмена,
Соцыялізму—
найпершы узвод.
Чуеш? —
угодкамі калышуцца сьцены...
Рушылі годы
ў паход!..
Чуеш? —
растуць за заводам заводы
І за гудком—гудок!
Гэй, комсамолія,—
Арш—у паходы!..
Гэй, комсамолія!
шырэй крок!
Гэй, на працу!
Дружна! Р-раз!..
Жвава!
Дружным крокам!..
За гудкі фабрычных мас
Па струхнелых эпохах!
Гэй, нацорна у паход
З песьняю машыны!..
Новы высіцца завод
І гудуць турбіны.
За вялікія гады!!!
Зьмерыць!..
Зрушыць!..
Здолець!..
Штандар працы першым ты
Узьнімеш, комсамолец!
Гэй, на працу!
Дружна!
Р-р-аз!
Узьнімай штандары!
У карпусох фабрычных мас
Грай, гудок
Ударны!

Мастацтва на вышыню нашых задач

На мастацтва, у пэрыяд абвостранай клясавай барацьбы за правядзеньне генэральнай лініі партыі, ускладаецца вялізарнейшая задача. Мастацтва павінна быць першакляснаю зброяй пролетарскай рэволюцыі, накіраванай на барацьбу за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, на пабудову соцыялізму ў нашай краіне. Усе працаўнікі літаратуры і мастацтва павінны ўключыцца ў рады ўдарнікаў пяцігодкі.

Профэсыйны беларускі тэатр зрабіў значны зрух наперад, як у сэнсе падбору новага орыгінальнага, патрэбнага нам рэпэртуару („ГУТА“) перакладнага („Першая конная“), а таксама і па выяўленьню свайго твару, як пэўнае тэатральнае адзінкі высокае культуры. Аднак, у гэтым напрамку яшчэ ня ўсё зроблена. П'еса „Гута“ была пастаўлена толькі тады, калі аб гэтым загаварыла пролетарская грамадзкасьць. „Першая Конная“ да яе пастаноўкі была ўзята ў штыхі. За тое тэатрамі ставіліся: „Апраметная“, „Астап“, „Крывая Аблона“. „Каля Тэрасы“ якую мы нядаўна з рэпэртуару БДТ-2 зьнялі ды шмат іншых. Такія-ж творы як „Гута“ лічыліся „прымітывам“.

Соцыяльны склад актораў профэсыянальных тэатраў таксама жадае многа лепшага. Адным словам—„праца“ ў тэатрах махровых нацдэм кратаў дала сябе знаць.

Нацыяналдэмократы, пры падтрыманьні нацыянал-опортуністых, зрабілі сваю справу. У выніку—і зараз ня рэдкі выпадкі зрыву працы тэатраў. Зараз неабходна ў баявым парадку рыхтаваць свае, новыя пролетарскія кадры ў галіне мастацтва, а перад тымі, якія маюцца, рашуча паставіць пытаньне: альбо з намі, альбо—прэч з дарогі! Не перашкаджайце нам будаваць пролетарскую культуру!

Мінулае праваопортуністычнае кіраўніцтва НКА на працягу раду год нічога не рабіла па разгортваньню ў БССР самадзейнага мастацтва, але, ня гледзячы на гэта, самадзейныя драмгурткі, музгурткі расьлі, як грыбы пасьля дажджу. Самадзейныя драмгурткі выявілі многа талёнавітых адзінак у галіне мастацтва. Іх трэба сабраць і, прапусьціўшы праз адчыняемыя ў студзені месяцы аднагадовыя драматычныя курсы, уліць у нашы тэатры, а таксама організаваць з іх два новыя раённыя вандроўныя тэатры.

На аснове самадзейнага тэатру організаваліся нашы ТРАМ'ы (Беларускі і Яўрэйскі). Гэта—новы тып нашага будучага соцыялістычнага тэатру. Беларускі ТРАМ ужо прявёў досыць значную работу, ім зроблена пастаноўка „Першы Штандар“, якую пролетарская грамадзкасьць Менску даволі цёпла прыняла. Яўрэйскі ТРАМ організаваўся толькі ў гэтым квартале.

Але, на вялікі жаль, ТРАМ'ы не атрымоўваюць належнае дапамогі, як з боку некаторых савецкіх установ (НКФ), якія недаацэньваюць ролю мастацтва, так і нашага профэсыйнага тэатру.

Нашы профэсыйныя тэатры пры правядзеньні свайй штодзённай работы забываюць пра задачу вялізарнай політычнай важнасьці—дапамогі разьвіцьцю самадзейнага мастацтва шляхам жывога інструктажу самадзейных клюбных драмгурткоў і пісьмовае мэтадычнае дапамогі вясковым драмгуртком. Для організацыі дапамогі неабходна ўтварыць пры Доме Селяніна габінэт па самадзейнаму мастацтву, а таксама выдаць часопіс, што дасьць мажлівасьць падняць мастацтва мас на больш высокую ступень.

Профэсыйны тэатр, у прыватнасьці БДТ-2, павінен вылучыць сталых працаўнікоў (на час знаходжаньня тэатру ў Менску) для мастацкае консультацыі работы нашых ТРАМ'аў, што дасьць мажлівасьць больш шпарка разгарнуць ТРАМ'аўскі рух у БССР.

Перад ТРАМ'амі стаіць задача—браць штурмам веды ў галіне мастацтва, гэтага магутнага сродку ўплыву, агітацыі і організацыі шырокіх працоўных мас, штурмаваць нашыя профэсыйныя тэатры, перавыхоўваць свіх настаўнікаў—профэсыйны тэатр, з тым, каб ператварыць іх у сапраўды рэволюцыйныя тэатры, якія-б дапамагалі рабочай клясе і яго партыі ў выкананьні конкрэтных задач, пастаўленых партыяй на даным этапе.

Праз самадзейнае мастацтва, праз ТРАМ'ы выявім таленты ў галіне мастацтва, драматургаў, актораў, якія дапамогуць выжыць рэпэртуарны голад, дапамогуць стварыць новы пролетарскі тэатр. Паставім-жа мастацтва на службу соцыялістычнага будаўніцтва!

І. Гурскі

ТАВАРЫШ КОМСАМОЛЕЦ!
ТВАЯ ПРАПАНОВА?

За масавае вопытніцтва, рацыяналізатарства і вынаходзтва

Камітэты і ячэйкі, шырэй разгортвайце па саўгасах і колгасах работу гурткоў рацыяналізацыі і вынаходзтва

Кожны саўгас і колгас--база гуртка. Комсамолец--яго організатар

Бюро ЦК ЛКСМБ у сваёй пастанове ад 27-га лістапада дало новыя паказаньні мясцом аб працягненьні сьвінаводчай эстафэты, фініш якое прызначан да X-га зьезду ЛКСМБ.

Застаецца вельмі кароткі тэрмін, у які трэба перабудаваць сваю работу і к фінішу прыйсьці з пэўнымі вынікамі па сьвінаводчай эстафэце.

Побач з тымі задачамі, якія сталі і стаяць перад комсамольскай эстафэтай па сьвінагадоўлі, трэба з усёй сур'ёзнасьцю паставіць пытаньне аб організацыі на мясцох гурткоў па масаваму вопытніцтву, рацыяналізатарству і вынаходзтву ў галіне сьвінагадоўлі, што будзе спрыяць больш пасьпяховаму вырашэньню праблемы сьвінагадоўлі.

Соцыялістычная рэконструкцыя сельскай гаспадаркі і выкананьне паказчыкаў пяцігодкі ў чатыры гады патрабуюць ад гаспадарак соцыялістычнага сэктару—саўгасаў і колгасаў, а таксама і ад усёй савецкай грамадзкасьці максымальнай увагі да правільнай організацыі вытворчасьці ў гаспадарках, да організацыі масавага вопытніцтва, рацыяналізатарства і вынаходзтва па пытаньнях сьвінагадоўлі.

Адначасова паўстае пытаньне і аб стварэньні ў саўгасах і колгасах кадраў па сьвінагадоўлі.

Гэтыя задачы магчыма пасьпяхова вырашыць толькі шырока разгарнуўшы ў саўгасах і колгасах масавае вопытніцтва, сельска-гаспадарчае вынаходзтва і рацыяналізатарства на грунце максымальнага скарыстаньня творчай здольнасьці і актыўнасьці працоўных.

У гэтай працы гурткі вынаходцаў і рацыяналізатараў павінны стаць асяродкамі для збору ўсіх каштоўных прапаноў па ўздыму вытворчасьці, па барацьбе з стратамі, прыцягваць да гэтай працы бядняцка-серадняцкія масы вёскі, каб, популярызуючы дасягненьні соцыялістычнага сэктару, садзейнічаць хутчэйшай колектывізацыі вакольных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Гурткі зьяўяцца організатарамі шырокіх колаў рабочых саўгасаў, колгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх гаспадарак па выкананьню плянаў сьвінагадоўлі і організацыі сустрэчных плянаў. Трэба дабіцца організацыі гурткоў, якія-б займаліся плянавай дапамогай разьвіцьцю сьвінагадоўлі ў саўгасах і колгасах.

Мэты гурткоў

Гурткі шырока знаёмяць з дасягненьнямі соцыялістычнага сэктару вакольныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі, організоўваюць навукова-дасьледчую працу ў гаспадарках, ажыцьцяўляюць дасягненьні навукі на практыцы, дабіваюцца хуткага скарыстаньня рацыяналізатарства і вынаходзтва, шырока популярызуюць вынікі сваіх вопытаў і дасягненьняў сярод саўгасаў і колгасаў.

Гурткі організоўваюцца на добраахвотных пачатках, але не абасоблена, а пры вытворчых нарадах саўгасаў і колгасаў: вытворчымі нарадамі, вопытнікамі, ударнікамі, комсамольскімі ячэйкамі, настаўнікамі, аграномамі, ячэйкамі ТД-Авіяхэму і Тэхмасу, дасьледчымі станцыямі і г. д. Гурткі па сьвінагадоўлі організоўваюцца пры наяўнасьці ня меней 5 членаў.

Чарговыя задачы гуртка

Гурткі масавага вопытніцтва, рацыяналізатарства і вынаходзтва па сьвінагадоўлі павінны зьвярнуць максымальную ўвагу на політызацыю ўсіх пытаньняў, якія разьбіраюцца гурткамі, г. зн. гурткі робяць установку на соцыялістычны сэктар у вёсцы і на ліквідацыю капіталістычных элемэнтаў вёскі, на ліквідацыю кулацтва як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі.

Пры разглядзе зьвязаных з соцыялістычнай рэконструкцыяй пытаньняў, с.-г. гурткі павінны засяродзіць увагу каля наступных момантаў:

Організацыя сельска-гаспадарчай вытворчасьці ў сьвінагадоўчых гаспадарках. За лепшую організацыю працы на сьвінарніках і ў гаспадарцы, за правільнае скарыстаньне цяглавай сілы ў гаспадарцы, за рацыянальны транспарт, за самую лепшую і танную будоўлю сьвінарнікаў, кухань і інш. па сьвінагадоўлі, за лепшую кармушку і стойла, за лепшы вучот агротэхнікі, за палепшаньне якасьці і павялічэньне маладняка ад адной маткі, за лепшае выкананьне пляну сьвінагадоўлі і організацыю сустрэчнага пляну. Як організаваць правільнае кармленьне, дагляд і ўтрыманьне сьвіней, як рацыянальна скарыстаць запасы кармоў у гаспадарцы, як організаваць скарыстаньне адкідаў у гаспадарцы, як лепш організаваць гэтую справу, як палепшыць агульнае становішча сьвінагадоўлі ў гаспадарках, організаваць выкананьне зооветмінімуму ў гасп. За павышэньне продукцыйнасьці і таннасьці сьвіны, за падрыхтоўку да організацыі большых запасаў сілосных кармоў, за організацыю выганаў для сьвіней, за новыя сельска-гаспадарчыя машыны, якія можна скарыстаць у гаспадарках. Асабліва зьвярнуць увагу на гадоўлю парасят асеньняга і зімовага апаросу.

Масавае вопытніцтва. Організаваць пастаноўку вопытаў на тэмы: гадоўля маладняка на розных бялковых нормах, уплыў рознай колькасьці бульбы на адкорм бэконных сьвіней, уплыў нізкіх тэмпэратур на бэконны адкорм і параўнальная аплата кармоў, хуткасьць росту розных кармоў і скарыстаньне адкідаў у гаспадарцы.

Па пытаньнях сельска-гаспадарчай вытворчасьці, агротэхнікі, гурткі зараз-жа могуць прыступіць да працы, шчыльна ўвязаўшы яе з загадчыкамі саўгасаў і праўленьнямі колгасаў, скарыстаўшы літаратуру па сьвінагадоўлі, якую можна знайсьці ў кожным раёне: Журыка С. „Як гадаваць парасят". 2-ое выданьне 1930 г. і Платона Н. на расійскай мове „Свиноводство".

Тут каротка пералічаны задачы і організацыйныя формы гурткоў, а програмныя заданьні рыхтуюцца для друку і хутка будуць выданы асобнай кніжкай.

Зараз трэба організаваць гурткі і паставіць для распрацоўкі тэмы, якія высоўваюць гаспадаркі па пытаньнях сьвінагадоўлі.

Комсамольскія ячэйкі павінны організаваць гэтую справу, уцягнуць у гурткі лепшых ударнікаў, брыгадзіраў, весь актыў гаспадаркі для палепшаньня справы сьвінагадоўлі.

Ствараючы гурткі, мы павядзем работу па выхаваньню кадраў па сьвінагадоўлі непасрэдна ў гаспадарках і гэтым мы дапаможам сьвінаводчым гаспадаркам хутчэй справіцца з пастаўленымі перад імі задачамі.

Мы зараз высунулі толькі організацыйныя формы, каротка вызначылі задачы, а ў чарговых артыкулах затрымаемся на програмных заданьнях і на тым, як самастойна можна організаваць вопытніцтва па сьвінагадоўлі.

К. Кіпрыянец.

Арышт контррэволюцыйнай інтэлігенцкай групы беларускіх нацыянал-дэмократаў

ДПУ Беларусі арыштавана контррэволюцыйная інтэлігенцкая група нац.-дэмократаў, якая складаецца ў пераважнай большасьці з былых эсэраў і белагвардзейскіх эмігрантаў, якія вярнуліся з-за граніцы.

Савецкі ўрад Беларусі ў свой час дазволіў зварот з эміграцыі шэрагу асоб дзякуючы таму, што яны запэўнівалі добрасумленна і чэсна працаваць у інтарэсах савецкага будаўніцтва. У сапраўднасьці, гэтыя асобы, скарыстаўшы а аказанага ім давер'я працягвалі сваю контр-рэволюцыйную дзейнасьць у згодзе з зарубежнымі буржуазнымі нац. фашысцкімі організацыямі і па іх указаньнях.

У ліку арыштаваных — былыя міністры БНР Ластоўскі, Цьвікевіч, Краскоўскі, Смоліч, а таксама Лёсік, Некрашэвіч і інш.

Вядзецца сьледзтва.

Паведамленьне

ЦКК НК РСІ і ЦСПСБ склікаюць на 2-XII г. г. а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні ЦСПСБ (заля пасяджэньняў). шырокую нараду—членаў экономсэктараў, савецкіх і гаспадарчых устаноў, груп „ЛК" і рабочых прадпрыемстваў, якія трымаюць шэфства над установамі, па пытаньню аб масавай праверцы фінансава-гаспадарчай дзейнасьці ўстаноў за 1929-30 год (даклад ад ЦК РСІ).

Яўка абавязкова і без спазьненьня. **НК РСІ і ЦСПСБ.**

Комсамол рыхтуецца да IX усесаюзнага зьезду

У сувязі з надыходзячым IX усесаюзным зьездам комсамолу, рабочыя-комсамольцы заводу „Скараход" у Ленінградзе праводзяць вялікую работу сярод моладзі заводу „Электрасіла". Праца вядзецца па лініі ўцягненьня моладзі ў комсамол, па выяўленьню прычын прарыву промфінпляну на заводзе „Электрасіла" і па ваеннай боце моладзі.

На здымку: дэлегаты гутараць з маладымі рабочымі заводу „Электрасіла".

Забясьпечыць мобілізацыю шырокіх працоўных мас у падрыхтоўцы да перавыбараў саветаў

Юнкорпасты, брыгады і юнкоры, уключайцеся ў агляд ходу справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў!

Зьмяшчаючы зварот брыгады газэты „Правда", якая абсьледуе ход кампаніі па перавыбарах саветаў на Беларусі,—газэта „Чырвоная Зьмена" уключаецца на дапамогу брыгадзе газэты „Правда". Адначасова рэдакцыя звяртаецца да ўсіх сваіх юнкораўскіх пастоў, брыгад і юнкораў з заклікам прыняць самы актыўны ўдзел у рабоце брыгады і аказаць ёй практычную дапамогу.

З 1-га сьнежня ўжо пачынаюцца выбары дэпутатаў. Нам неабходна на старонках „Чырвонай Зьмены" шырока асьвятліць ход падрыхтоўкі работы сярод працоўных мас; як праходзіць справаздачная кампанія сельскіх саветаў, работа па выпрацоўцы наказаў, барацьба з агітацыяй кулацтва, духавенства і інш., як практычна ўдзельнічаюць комсамольскія організацыі ў правядзеньні ўсёй справаздачна-падрыхтоўчай і перавыбарчай кампаніі, як яны наладзілі сваю працу ў сапраўднай організацыі батрацкай і бядняцка-серадняцкай асобнай моладзі для практычнага ўдзелу ва ўсёй праводзімай рабоце па перавыбарах саветаў, рашучай барацьбы з кулацтвам і іншымі клясава-варожымі элемэнтамі. Мы павінны асьвятліць і падсумаваць на старонках газэты як станоўчыя, так і адмоўныя бакі гэтай работы комсамолу.

Комсамольскія ячэйкі, комсамольцы, юнкоры павінны зараз-жа разгарнуць работу па організацыі пры кожным сельсавеце, колгасе, саўгасе юнкораўскіх пастоў „Чырвонай Зьмены" (дзе іх яшчэ няма) для сыстэматычнай інформацыі „Чырвонай Зьмены" аб ходзе ўсёй работы.

Чакаем матар'ялаў.

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена".

Таварышы рабочыя і працоўныя сяляне!

Цэнтральны орган ЦК УсеКП(б)—„Правда" організавала брыгаду для абсьледваньня ходу кампаніі па перавыбарах саветаў у Беларусі. Вялізарнае політычнае значэньне перавыбараў саветаў патрабуе мобілізацыі ўсіх сіл на барацьбу з клясавым ворагам, які ўсякімі мерамі прабуе аслабіць нашу работу, сарваць нашае соцыялістычнае будаўніцтва.

Брыгада зварачаецца да ўсіх рабочых, працоўных сялян з просьбай прысылаць матар'ялы, якія-б паказвалі, як ідзе растлумачальная работа ў масах, як праходзяць справаздачы дэпутатаў, якія выпрацоўваюцца наказы, як організацыі на мясцох змагаюцца супроць варожай агітацыі кулацтва, духавенства і інш.

Таварышы, організуйце на заводах, сельсаветах, колгасах ударныя брыгады ў дапамогу цэнтральнай брыгадзе «Правды».

Таварышы рабселькоры, вы павінны дапамагчы організаваць гэтыя брыгады, стаць на чале іх і павесьці энэргічную работу па выяўленьню недахопаў перавыбарчай кампаніі.

Увесь матар'ял накіроўваць у рэдакцыі газэт „Зьвязда", „Рабочий" і „Савецкая Беларусь". Туды-ж паведамляць пра ўсе організаваныя брыгады для ўстанаўленьня сувязі з цэнтральнай брыгадай „Правды".

ЦЭНТРАЛЬНАЯ БРЫГАДА „ПРАВДЫ".

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР—РЭДКОЛЕГІЯ

Згублены

— Комсам. біл. за № 15504 на імя Круковай Ал., выд. Вульскім РК КСМ.

— Комсам. біл. за № 106209, на імя Бляхава А. Г., выд. Віцебскім РК КСМ.

— Комсам. пасьведчаньне, на імя Гладкага П. З., выд. Мен. аб'яднанай профтэхшколай.

— Комсам. біл. за № 132337, на імя Чахоўскага Міколы, выд. Сьмілаўскім РК.

— Сяброўскі білет за № 50516, на імя Рудовіча П. Д., выд. ЦП саюзу Мэдсанпрацы.

— Комсам. біл. за № 128202, на імя Шулякоўскай, выд. Мен. АК КСМ.

— Пашпарт на імя Сьляпяна, выд. Мен. адм. аддзелам.

— Комсам. біл. за № 5017.. імя Цімкава Ін. Яз., выд. Ба..скім АК КСМ.

— Комсам. біл. за № 6392.. імя Іванкова С. М., выд. Ка..скім РК КСМ.

— Комсам. біл. за № 138.. імя Машкарова Р. І., выд. ..рэльск. РК КСМ.

— Комсам. біл., на імя К.. В. Д., выд. Мазырскім РК КСМ.

— Ком. за № 138043, на.. Насановіча Н. С., выд. Любан.. РК КСМ.

— Комсам. біл. за № 21.. імя механіка У. Б., выд. Мен.. КСМ.

— Пашпарт на імя Рубі.. Янкі, выд. Ратамскім сельса..

— Комсам. біл. за № 12026.. імя Рубіцкага Янкі, выд. Мен..

Галоўлітбел № 599

Друкарня імя тав. Сталіна